# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 17 красавіка 1997 года, чацвер, № 6 (1761)


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Споўнілася 70 гадоў з дня нараджэння былога рэктара Белдзяржуніверсітэта Леаніда Іванавіча Кісялеўскага, акадэміка АНБ, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара.

Тым, хто цікавіцца новымі камп'ютэрнымі тэхналогіямі, прапануем працягнуць знаёмства з Інтэрнэтам

Стар. 3

Ці ведаеце вы, хто такі "белдзяржуніверсітэцкі" Гусман? А чаму самалёты не машуць крыламі?.. У вас ёсць шанец даведацца пра гэта, калі вы прачытаеце, як праходзіў універсітэцкі конкурс КВЗ

Стар. 4

• • •

На філалагічным факультэце 29 сакавіка адбылася традыцыйны штогадовы вечар сустрэчы з выпускнікамі. Як і заўсёды, на сустрэчу прыйшлі выпускнікі факультэта розных гадоў.

• • •

Музей земляз наўства геаграфічнага факультэта БДУ праводзіў VIII міжнародную мінералагічную выставу-кірмаш "Каменная казка", якая адбылася 11-13 красавіка.

• • •

У гарадское аддзяленне міліцыі Ленінскага РАУС 27 сакавіка ў 3 гадзіны начы звярнуўся студэнт БДУ, грамадзянін Ірана. Ён заявіў, што шляхам узлому яго пакоя ў інтэрнаце па вул. К.Маркса быў здзейснены крадзёж вялікай сумы валюты.

## ТЭЛЕТАЙП

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Учора Сёння Заўтра

Мінскі гарадскі цэнтр занятасці насельніцтва 24 красавіка праводзіць Дзень прафарыентацыі "Прафесія і моладзь" для моладзі Маскоўскага раёну ў кінатэатры "Бярэсце" (пр-т імя газеты "Праўда", 25).

Плануецца кансультаванне моладзі па пытаннях выбару і перамены прафесіі, заканадаўства аб занятасці, рынку працы, прафесійнага навучання.

Запрашаем прыняць удзел ва ўказаным мерапрыемстве.

*Мінскі гарадскі цэнтр занятасці насельніцтва*

## Медыум: раскрый свой талент

Медыум — палова студэнцкага жыцця. І 28 сакавіка на факультэце журналістыкі яго адсвяткавалі так, як толькі былі здольныя, з усімі магчымымі наступствамі.

Крэслаў у зале, зразумела, хапіла не ўсім студэнтам, што стала суб'ектыўнай прычынай ацэнкі вечара: тыя, хто стаяў, палічылі медыум няўдалым, а тыя, хто сядзеў,— наадварот, былі шчыра задаволеныя.

На вечарыне выступалі першакурснікі, якія таленавіта, па-майстэрску паказалі "спакушэнне выкладчыка" дзеля атрымання заліку.

Аднак лепшым нумарам, безумоўна, сталі прыпеўкі другакурсніц Вольгі і Наталлі. Спачатку яны павіншавалі выкладчыка беларускай мовы М.Р.Каваленку з днём нараджэння (да чаго далучаецца і наша газета), а потым пачалі спяваць пра новага дэкана і закаханых у яго дзяўчат, спалучыўшы кампліменты з прызнаннямі.

Вечар, як можна здагадацца, скончыўся дыскатэкай.

*Валерыя АЎСЯНІК*

*Шаноўныя чытачы! Вы, вядома, заўважылі, што змяніўся выгляд загалоўка нашай газеты. Мы спадзяемся, што гэтая замена не выкліча асаблівых пярэчанняў. Разам з тым, мы чакаем вашы прапановы і заўвагі па далейшаму паляпшэнню як загалоўка, так і агульнага стылю газеты. Аўтараў самых цікавых прапановаў чакае прыемны сюрпрыз.*

*Калектыў рэдакцыі*

## Чалавек першай паласы

*Хто даўно не быў на факультэце журналістыкі і каму ягонае жыццё ўяўлялася спакойным і павольным, адразу зверне ўвагу на мэтанакіраваны рух, які там зараз пануе. Рамантуюцца аўдыторыі, абмяркоўваюцца новыя вучэбныя і рабочыя планы, з'яўляецца нават новая мэбля, утульна стала ў дэканаце. Ствараецца такое ўражанне, што ўсе запаліліся аптымізмам і новай творчай энергіяй да працы. Многія звязваюць такія перамены з прыходам маладога энергічнага дэкана — Васіля Пятровіча Вараб'ёва. На пачатку студзеня яму споўнілася 40 гадоў. Дарэчы, у свой час Васіль Пятровіч быў самым маладым рэдактарам газеты "Беларускі універсітэт" (у 22 гады), потым у (28 гадоў )— самым маладым кандыдатам навук на факультэце, а ў 33 — загадчыкам кафедры тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі. Нагадаю, што да свайго прызначэння дэканам Васіль Пятровіч узначальваў Упраўленне інфармацыі Вярхоўнага Савета Беларусі.*



## Васіль Вараб'ёў: "Ні адна краіна свету не можа абысціся без сваіх журналісцкіх кадраў"

*— Васіль Пятровіч, для Вас была нечаканай прапанова ўзначаліць факультэт журналістыкі?*

— Сама прапанова была, зразумела, нечаканай. Так адбылося, што папярэдні дэкан пажадаў пайсці ў дактарантуру. Дзесьці ў канцы студзеня кіраўніцтва універсітэта прапанавала мне гэтую працу. Спачатку я быў прызначаны выконваючым абавязкі дэкана, потым 5 сакавіка адбыўся Савет факультэта, які падтрымаў маю кандыдатуру, і 7 сакавіка загадам рэктара быў прызначаны дэканам.

*— Васіль Пятровіч, Вы ўзначальвалі прэс-службу Вярхоўнага Савета і маеце першы клас служачага дзяржаўнага апарату, на ўзроўні першага намесніка міністра... Не шкадуеце?*

— І рэктар, Аляксандр Уладзіслававіч, мае першы клас служачага дзяржапарату, памочнік рэктара, адзін з загадчыкаў кафедры... Яшчэ ёсць ва універсітэце людзі, якія пакінулі доволі высокія пасады дзеля універсітэта. Не, я не шкадую. Наадварот, пяцігадовы вопыт працы ў Вярхоўным Савеце, тыя кантакты, якія склаліся, я паспрабую скарыстаць на карысць і факультэта журналістыкі, і ўсяго універсітэта.

*— Дарэчы, зусім нядаўна хадзілі чуткі, што факультэт журналістыкі збіраюцца ці то закрыць, ці то рэарганізаваць...*

— Ні адна краіна свету не можа абысціся без сваіх журналісцкіх кадраў. І лепшае пацвярджэнне гэтай думкі — нядаўні ліст з Дзяржаўнага камітэта па друку з просьбай правесці ў гэтым годзе размеркаванне журналістаў: заявак паступіла на паўсотні спецыялістаў. Хаця мы выпускаем у гэтым годзе толькі каля 40 чалавек. Як бачым, запыты грамадства, дзяржавы — значна большыя. Думаю, што гэты факт — яскравае абвяржэнне чутак. Больш таго, попыт на спецыялістаў няўмольна расце, і дзённае аддзяленне журфака, на якое паступаюць выпускнікі сярэдніх школ, пажадана пашырыць, каб залічваць 75 чалавек на першы курс па бюджэтнаму фінансаванню. Прафесіяналы для літаратурнай работы ў газеце, часопісе, выдавецтве, на радыё і тэлебачанні — такія спецыялізацыі існуюць зараз на журфаку — як хлеб, як паветра неабходны. А пагалоскі аб закрыцці журфака пайшлі пасля таго, як была выказана ідэя: набор на факультэт рабіць выключна на аснове заяў асоб, што маюць вышэйшую адукацыю. Дарэчы, такое спецаддзяленне ў нас існуе ўжо некалькі гадоў. Мы запрашаем на вучобу людзей з вышэйшай адукацыяй, якія завочна за тры гады атрымліваюць на факультэце яшчэ і журналісцкую кваліфікацыю. Акрамя таго, ёсць завочнае аддзяленне для людзей з сярэдняй адукацыяй, дзе тэрмін навучання шэсць гадоў. У гэтым годзе плануецца адкрыць і дзённае спецаддзяленне для людзей з вышэйшай адукацыяй з тэрмінам навучання ў 2 гады.

Іншая справа, якія спецыялісты грамадству патрэбны і будуць заўтра адпавядаць часу? Прафесіяналы ў сваёй спецыялізацыі, майстры слова, шырокаадукаваныя гуманітарыі, якія ўмеюць адлюстроўваць і аналізаваць факты, праблемы і з'явы рэчаіснасці, канструктыўна ўзаемадзейнічаць з рознымі сацыяльнымі інстытутамі. Але толькі гэтых, кваліфікацыйных, якасцей мала. Неабходны дыпламаваныя спецыялісты, здольныя ўмацоўваць дзяржаўнасць краіны, нарошчваць культурны патэнцыял грамадства, будаваць прававыя адносіны праз стварэнне і ўдасканаленне інфармацыйнай прасторы Беларусі і міжнароднай супольнасці.

Дарэчы, новая спецыяльнасць "інфармацыя і камунікацыя" не выпадкова адкрыта на факультэце журналістыкі: яна генетычна звязана з журналістыкай. Супрацьпастаўляць яе нельга, як нельга і атаясамліваць з журналістыкай. Рэч у тым, што журфак у вучэбным і навуковым плане цікавіць масавая камунікацыя, масавая інфармацыя. Супрацоўнікаў прэс-службаў, спецыялістаў у галіне сувязяў з грамадскасцю, прафесіяналаў у галіне рэкламы, спецыялістаў па аўдыявізуальнай камунікацыі мы можам рыхтаваць толькі спалучаючы класічную журналісцкую адукацыю, якая склалася на факультэце, з комплексам дысцыплін па новых інфармацыйных тэхналогіях і нарошчваючы цыкл філасофска-псіхалагічных навук.

Увогуле, дыяпазон профільных спецыялізацый на факультэце пашыраецца. На сённяшні дзень, акрамя ўжо названых вышэй, функцыяніруе дванаццаць школ: спецыяліст па камп'ютэрнаму дызайну газеты, рэдактар рэкламы, рэжысёр тэлебачання, каментатар радыё і тэлебачання, рэдактар выдавецтва, перакладчык, аглядальнік па культуры, палітычны аглядальнік, эканамічны аглядальнік, фотарэпарцёр, журналіст-міжнароднік і інш. Такі гарызонт навучання ўспрыняты студэнтамі, хаця гэта — даволі значная нагрузка на выкладчыкаў. Аднак грамадская важнасць гэтай справы высокая.

З уводам спецыялізацый вучэбны працэс набывае індывідуалізаваны характар. Пачынаючы з трэцяга курса, выкладчыкі ў групах спецыялізацый могуць працаваць з пяццю-васьмю студэнтамі. Такая арганізацыя вучэбнага працэсу рыхтуе магчымасць пераходу да ступенчатага навучання.

Мы вельмі, папраўдзе кажучы, спадзяемся на нашы сталыя кадры. Творчую атмасферу навучання стварае калектыў, у якім — вопытныя майстры навуковай, педагагічнай і літаратурна-публіцыстычнай справы: прафесары Е.Л.Бондарава, І.І.Сачанка, Б.В.Стральцоў, М.Я.Цікоцкі, А.І.Наркевіч, Я.Р.Радкевіч, дацэнты В.І.Іўчанкаў, В.Р.Булацкі, А.К.Свораб, Н.А.Сніцарава, Л.Ф.Шылава, Л.П.Саянкова і інш.

Максімальна імкнемся ўключыць у навучальны працэс спецыялістаў-практыкаў. У нас выкладаюць намеснік рэдактара "Рэспублікі" кандыдат гістарычных навук А.К.Акулік, галоўны рэдактар "Беларускай думкі" кандыдат філасофскіх навук У.П.Вялічка, супрацоўнік "Беларускай нівы" кандыдат філалагічных навук Л.П.Белякова, дырэктар выдавецтва "Універсітэцкае" кандыдат філалагічных навук У.К.Касько. Плануем запрасіць яшчэ шэраг вядомых у журналістыцы спецыялістаў, якія маюць вучоную ступень.

*— Размеркаванне... Некаторыя студэнты пужаюцца гэтага, некаторыя наадварот радуюцца, што дзяржава паклапацілася пра іх працаўладкаванне. Як яно будзе праходзіць у гэтым годзе?*

— Сапраўды, дыяпазон успрымання працэсу размеркавання — ад спалоху да радасці — вялікі. Але калі да кожнага выпускніка падысці індывідуальна, калі максімальна улічыць і магчымасці і пажаданні выпускнікоў, і клопат дзяржавы пра тое, каб мясцовы друк папоўніўся маладымі спецылістамі, то гэта — нармальны працэс, і нічога страшнага ў ім няма. Дзяржава рыхтуе спецыялістаў, таму яна і разлічвае на іх падтрымку. Неабходна імкнуцца, каб інтарэсы дзяржавы і інтарэсы выпускніка супалі.

(Працяг на стар.2)

## Васіль Вараб'ёў:

# "Ні адна краіна свету не можа абысціся без сваіх журналісцкіх кадраў"

*(Працяг. Пачатак на стар. 1)*

Падлічана. што ў большасці раённых газет маецца не менш дзвюх вакансій і па два супрацоўнікі не маюць журналісцкай адукацыі. У зоне Чарнобыля ўвогуле рэдакцыі ў крытычным становішчы — там толькі па тры-чатыры супрацоўнікі. Неабходна павялічваць набор на першы курс. каб не пакідаць за мяжой вышэйшай адукацыі таленавітых юнакоў і дзяўчат. З 300-400 абітурыентаў мы залічваем на вучобу толькі 50 па бюджэтнаму фінансаванню і 100 — на кантрактнай аснове. І гэта — на больш чым 10-мільённую краіну! У творчасці заўсёды павінна прысутнічаць канкурэнцыя. спаборніцтва, у рэдакцыях — права выбару таленту.

Дарэчы. сёлета размеркаванне адбудзецца 23 красавіка. Створана універсітэцкая камісія. Старшыня камісіі — першы прарэктар. у яе ўваходзяць — дэкан. намеснік дэкана. загадчыкі кафедраў. прадстаўнікі Дзяржкамдруку і тэлерадыёкампаніі Беларусі. Зараз Міністэрства адукацыі распрацоўвае сам механізм працаўладкавання маладога спецыяліста.

***— Васіль Пятровіч, калі ласка, параўнайце студэнтаў Вашых часоў і сённяшніх.***

— Студэнт ва ўсе часы студэнт. Ганаровае. пачэснае. рамантычнае званне! Тым больш — студэнт БДУ! Студэнт журфака! Студэнту даецца 5-гадовы тэрмін не толькі сотні кніжак прачытаць. не толькі праслухаць сотні лекцый, але і прадастаўляецца час для самастойнага сталення. І ад кожнага студэнта асабіста залежыць. як ён выкарыстоўвае гэты шанс. Ці для таго. каб развіваць. шліфаваць свае прафесійныя навыкі. чалавечыя, духоўныя якасці. ці ён безвынікова марнуе лепшы перыяд свайго жыцця. Таму мяне не здзіўляюць выпадковыя адозвы і ў вусных размовах, і ў газетах, калі некаторыя выпускнікі кідаюць камяні, накшталт: "Мне факультэт нічога не даў". Гэта могуць гаварыць толькі людзі, якія вельмі легкадумна ставіліся і ставяцца да сваіх лепшых гадоў, што прайшлі для іх безвынікова. І безвынікова па іх уласнай віне.

Зразумела ж. журфак не рыхтуе спецыялістаў, што робяць гладышы. Пры такім рамястве можна на пальцах паказаць: вось так рабі ўсе свае наступныя 50 гадоў. Вельмі спрошчанае разуменне вучэбнага працэсу на творчым факультэце! Выкладчык, кафедра, ды і ўвесь факультэт можа даць толькі навыкі. агульныя прынцыпы. падыходы. Але без штодзённай самастойнай працы ніколі студэнт не вырасце кваліфікаваным спецыялістам.

***— Васіль Пятровіч, якая, на Ваш погляд, зараз самая галоўная праблема існуе на факультэце журналістыкі?***

— Самая балючая праблема — дрэнная матэрыяльна-тэхнічная база факультэта. Перш за ўсё няма свайго дома. У нас навучаецца 700 студэнтаў на плошчы 1300 квадратных метраў. Атрымліваецца. што на кожнага студэнта прыходзіцца менш за 2 метры. Пры норме для ВНУ — не менш 10 квадратных метраў на студэнта. А для такога факультэта, як наш. гэтыя нарматывы павінны быць яшчэ вышэйшыя.

Апошнія 10-15 гадоў факультэт, па сутнасці. разарваны на некалькі кавалкаў. Адсюль, дарэчы. не толькі праблемы ў навучальным працэсе. навуковым, але гэта ўплывае на псіхалагічны стан выкладчыкаў і студэнтаў. Агрэсіўнасць некаторых нашых выпускнікоў абумоўлена і гэтым — пяць гадоў студэнты правучыліся на журфаку, але не мелі ні ўтульных аўдыторый, ні добрых лінгафонных, камп'ютэрных класаў, не мелі магчымасці плённа папрацаваць у прасторнай чытальнай зале. Адсюль і вядомае "собака бывает кусачей..."

Зараз для дэканата выкарыстоўваем хол трэцяга паверха. лекцыі чытаем у холе актавай залы і ў калідоры перад актавай залай. І ў той жа час факультэт жаданы для многіх выпускнікоў школ, таму што журналіст — вельмі творчая, прыцягальная прафесія. Нагадаю. што толькі за 1996-97 навучальны год факультэт прынёс у бюджэт універсітэта за навучанне каля 2,5 мільярдаў рублёў. Калі пералічыць гэтую суму на плошчы, якія займае факультэт, то атрымліваецца. што кожны квадратны метр журфака, уключаючы і калідоры, даў прыбытак звыш 70 долараў. Такой эфектыўнасці выкарыстання плошчы могуць пазайздросціць нават універсітэцкія спецфакультэты, камерцыйныя ВНУ.

Перад факультэтам журналістыкі вельмі складаная і сур'ёзная задача — рыхтаваць спецыялістаў мас-медыя, якія змогуць творча і кваліфікавана працаваць і ў наступным тысячагоддзі. Каб спецыялісты знайшлі сваё месца ў сферы масавых камунікацый. факультэту журналістыкі неабходна самае сучаснае камунікацыйнае абсталяванне. Прычым факультэт журналістыкі павінен у гэтай галіне быць крыху вышэй сярэдняга тэхнічнага ўзроўню нацыянальных сродкаў масавай камунікацыі. Нельга далей выкарыстоўваць у навучанні маральна і тэхнічна састарэлае абсталяванне, бо вопыт у галіне адукацыі сведчыць пра тое. што менавіта універсітэты рухаюць наперад духоўны, тэхнічны, тэхналагічны і навуковы патэнцыял краіны.

З мэтай удасканалення навучання неабходна стварыць адзіны факультэцкі цэнтр камунікацыйных тэхналогій, які ў сваю чаргу будзе падзяляцца на чатыры тэхналагічна завершаныя камунікацыйныя звяны. Першае — тэлевізійна-студыйны комплекс. Другое звяно — радыёстудыя. якая павінна дапамагаць падрыхтоўцы журналістаў радыёвяшчання і даць навыкі работы з гукам іншым навучэнцам факультэта. Трэцяе звяно — рэдакцыйна-выдавецкі комплекс. прызначаны для навучання студэнтаў сучасным тэхналогіям у галіне друку. Чацвёртае звяно — камп'ютэрны клас і клас мультымедыйных тэхналогій.

Для ўдасканалення навучання на факультэце журналістыкі таксама істотную ролю павінна адыграць відэатэка. Яе магчымасці дапамогуць прафесійнай адукацыі як тэлерадыёжурналістаў, так і журналістаў друкаваных выданняў, спецыялістаў ў галіне інфармацыі і камунікацыі. Лінгафонны кабінет дазволіць даць больш трывалае і дасканалае веданне замежных моў студэнтам усіх спецыялізацый факультэта. Патрабуе поўнага пераабсталявання і фоталабараторыя.

Наша беларуская журналістыка, моцная аналітыкай, літаратурным майстэрствам. на якасны перыяд адстае ў тэхнічным забеспячэнні збору. апрацоўкі і распаўсюджвання інфармацыі. Калі ў кароткі тэрмін не камп'ютэрызаваць вучэбны працэс, то да канца стагоддзя мы не здолеем стварыць моцную інфармацыйную прастору ў змястоўных, прававых адносінах.

Нам патрэбны ўсяго два камп'ютэрныя класы, каб пасадзіць за рэдактарскія пульты студэнтаў. А чаму нам не мець радыёстанцыю, сваю эфірную хвалю, каб высокапрафесійны універсітэцкі голас гучаў на ўсю рэспубліку?

***— Васіль Пятровіч, Вы 8 гадоў працавалі рэдактарам газеты "Беларускі універсітэт", што Вы можаце пажадаць газеце і яе чытачам?***

— Натхнёнасці газеце. А чытачам — прыхільнасці да сваёй роднай газеты. Час рэдактарства ў сваім лёсе лічу самым шчаслівым і плённым.

• • •

**Барыс Васільевіч СТРАЛЬЦОЎ, Заслужаны дзеяч культуры, доктар філалагічных навук, прафесар:**

*— Я мяркую, што на факультэце павінны існаваць розныя формы навучання, у тым ліку з тэрмінам навучання ў 2 гады, каб рыхтаваць рэпарцёраў. І, зразумела, неабходна пашыраць спецыялізацыі. Увогуле, факультэту патрэбен свой дом, каб і студэнтам было дзе збірацца, і людзей можна было запрашаць. Было б добра стварыць на факультэце літаратурную групу па выданню вучэбнай і метадычнай літаратуры для студэнтаў. Апошняе дзесяцігоддзе амаль нічога не выдавалася. Гэта не значыць, што ў нас няма падрыхтаваных да друку матэрыялаў, проста выдаць цяпер гэта ўсё вельмі дорага.*

**Міхаіл Яўгенавіч ЦІКОЦКІ, Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар філалагічных навук, прафесар:**

*— Ці заўважаю я нейкія перамены на факультэце? Дакладна магу сказаць — арганізаванасць і дысцыпліна лепшымі сталі. З'явілася надзея на лепшае, ёсць праблеск. Але час пакажа — усё наперадзе.*

*Гутарыла*
*Таццяна КАЗАК*

**Спроба пяра**

# Прывітанне, журфак!

Ах, журфак, журфак. Яшчэ паўгода таму ты быў такі далёка-недасягальны. А зараз... Зараз стаў блізкі і родны. Кожны дзень хочацца вяртацца сюды зноў і зноў... Пройдзеш па вузкіх калідорах, пасядзіш у цеснай аўдыторыі і на душы адразу становіцца лёгка, радасна, прыемна.

...Але асабліва прыемна стаяць у гардэробе, у чарзе з доўгім-доўгім "хвастом" (а іншым разам і з некалькімі). Толькі тут можна "шчыльна" пазнаёміцца са сваімі аднакурснікамі. Вось гэты — нахабны: абмінае "хвост" чаргі і накіроўваецца ў "галаву", шырока растапырваючы локці, смела наступаючы сваім 45-м па чужых рэчах; мабыць, каб мог, дык і па галавах ступаў бы. Вось гэты — сарамлівы: хадзіце, хлопцы, да мяне, усіх уперад прапушчу — і становіцца другая чарга "блатных". Аднак асноўная маса стаіць, хіхікае...

Другая "славутасць" нашага факультэта — актавая зала, ці найвялікшая і самая шырокая аўдыторыя. Зойдзеш — спярша цёмна, халодна. А як уключаць святло, як надыхаюць за дзве пары верныя таварышы — становіцца цёпла і ўтульна. Для тых, хто яшчэ не прыстасаваўся да тутэйшых умоваў: калі канспект не змяшчаецца на парце, вядома, імправізаванай, складзіце яго ўдвая ці ўтрая. Калі не атрымліваецца — папрасіце суседа спераду адхінуцца ад спінкі крэсла ці ўвогуле знікнуць.)

Акрамя таго, наша актавая зала аказвае паслугі тым студэнтам, якія забыліся ці не паспелі прыняць зранку халодны душ. Моцнага напору не абяцаем, але вада будзе кропаць велізарнымі кроплямі доўга і раўнамерна.

Наогул, жывём мы тут весела, дружна, як сапраўдныя студэнты. Прызнацца, усе экзамены і выпрабаванні сесіі былі для нас (і, спадзяюся, будуць далей) сапраўдным святам. Праўда, пасля сканчэння "свята" многія студэнты ўздыхнулі з палёгкай: пачаліся звычайныя шэрыя будні. Журфак зноў сустракае нас гасцінна расчыненымі дзвярыма, ізноў запрашае да сябе.

*Кацярына*
*МАРЫНАВА*

**Майстроўня**

*Антон СІДАРЭНКА*

# "Навальніца"

*Гумарэска*

Жыву я ў простым доме на трэцім паверсе, разам з сабакам Маруськай і жонкай Люськай. Аднойчы чую — званок у дзверы. Адчыняю. На парозе — мужык у нейкай квяцістай адзежы, у руках скрыня, на нагах дзіўныя чаравікі, на галаве вушы і валасы.

— Добры дзень!— павітаўся вушасты.

— І вам дзень добры,— адказаў я, адганяючы сабаку ад дзвярэй.— Маруська,— кажу,— адыдзі, не замінай чалавеку.

— А я да вас, Іван Іванавіч,— засмяяўся чалавек.— Па вашую душу.

Тут я аж здрыгануўся: адкуль ён мяне ведае? А што, калі ён раптам з міліцыі? А чаму тады са скрыняй і вопратка такая дзіўная? Пэўна, гэта такі новы амапаўскі камуфляж... Не трэба было ў 75-м годзе з калгаса той рухавік красці! Казала ж жонка, усё адно знойдуць!

— Вы праходзьце, грамадзянін начальнік,— кажу я вушастаму і вяду яго ў пакой.— Калі вы пра той рухавік клапоціцеся, дык не хвалюйцеся: я яго ў той самы дзень у Фонд міру прэзентаваў.

Кажу так, а сам хуценька бутэльку на стол — хоп!— стаўлю: раптам усё абыдзецца?

— Які рухавік?— пытае квяцісты.— Я да вас прыйшоў як прадстаўнік японскай фірмы "Хірошынаяшы".

Прынёс наш новы апарат — электронны агрэгат для паляпшэння клімату ў хаце. "Навальніца".

— З фірмы?— з палёгкай выдыхаю я і хуценька хаваю бутэльку ў шафу.

— Так!— з гонарам адказвае валасаты і пачынае нешта даставаць са скрыні.— Нашая фірма прапануе вам "Навальніцу" — лепшы сродак для ачысткі хатняга паветра. Ідзе ў вас гулянка, гасцей відзьма-нявідзьма, усе жадаюць забаўляцца, але ж у кватэры — дым каромыслам, прадыхнуць няма чым. Што вам у гэтым выпадку дапаможа?

— Не што, а хто,— папраўляю я яго.— Дапаможа мне сабака Маруська і жонка Люська. Кінуцца яны на гасцей і выганяць усіх на двор.

— Навошта спадзявацца на жывёл і жанчын, сябра?— радасна кажа мужык.— "Навальніца" зробіць усё значна хутчэй.

Дастае ён са скрыні апарат, падключае да разеткі і цісне на нейкую кнопку. Праз пару секундаў раптам раздаюцца нейкія грымоты. А праз паўхвіліны пад столлю збіраецца сапраўдная дажджавая хмара і ідзе сапраўдны дождж з маланкай, ды вада пабегла па ўсёй кватэры.

— Гэта... мужык...— разгублена кажу я, але тут навальніца пачынае сціхаць. Па кватэры — азонавы водар чыстага паветра, а праз дыван на падлозе прабіваецца прыгожая кветкавая паляна. Па мэблі пачынае віцца плюшч, а вакол люстры лётаюць матылькі і нейкія дробныя птушкі.

— Прыгажосць якая!— замілавана ўздыхнуў я, пусціў слязу.— Як у дзяцінстве... Вой, глядзі, абабак!

Толькі я за грыбам нагнуўся:

— Гэта што ты за свінушнік тут развёў! На ўсюдыходзе не пераехаць!— жонка з крамы вярнулася.— А ну, забірай свае балоты ды каціся адсюль!

Схапіла яна швабру ды пачала нас з фірмачом лупцаваць. А Маруська ўчапілася вушастаму ў штаніну. Ён спалохаўся, схапіў скрыню — ды на лесвіцу. Я за ім:

— Бачыш зараз, якая ў мяне "Навальніца" у хаце жыве?— кажу я небараку з японскім апаратам.— Добра яшчэ, што я не разгубіўся, паспеў бутэльку схапіць. Пойдзем, браце, вып'ем. Табе ж усё адно з гэтай японскай штукай няма чаго ў нас рабіць пакуль што.

# Да 70-годдзя з дня нараджэння

*12 красавіка 1997 года споўнілася 70 год з дня нараджэння былога рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта, загадчыка кафедры атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, акадэміка АНБ, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Леаніда Іванавіча Кісялеўскага.*

Ён нарадзіўся ў Мінску. Працоўную дзейнасць пачаў у 1944 годзе электраманцёрам Мінскага вагонарамонтнага завода. У 1952 годзе скончыў фізіка-матэматычны факультэт Белдзяржуніверсітэта, пасля чаго выкладаў фізіку ў Мінскай сярэдняй сельскагаспадарчай школе. З 1955 года навучаўся ў аспірантуры, а з 1958 — працаваў выкладчыкам Мінскага педагагічнага інстытута. З 1959 года Леанід Іванавіч працаваў у Інстытуце фізікі АН БССР, дзе прайшоў шлях ад старшага інжынера-канструктара да загадчыка лабараторыі спектраскапіі нізкатэмпературнай плазмы і намесніка дырэктара па навуковай рабоце. З 1978 года Л.І.Кісялеўскі — галоўны вучоны сакратар Прэзідыума Акадэміі навук БССР. У 1983 годзе ён быў прызначаны рэктарам Белдзяржуніверсітэта.

У АН БССР у поўнай меры раскрыўся талент Л.І.Кісялеўскага як выдатнага фізіка і буйнога арганізатара навукі. Ён унёс вялікі асабісты ўклад у станаўленне беларускай навуковай школы фізікі плазмы, якая грунтоўна зарэкамендавала сябе як унутры краіны, так і ў міжнародных маштабах. Буйным навуковым дасягненнем Леаніда Іванавіча стала распрацоўка метадаў атрымання высокастабільнай электраразраднай плазмы і дэтальнае вывучэнне працэсаў узаемадзеяння плазменных плыняў з цвёрдымі матэрыяламі. Пры гэтым былі выяўленыя і растлумачаныя асаблівыя паводзіны плазмы, якая пашыраецца ў вакуум, у зоне яе кантакту з паверхняй. Важную ролю ў плазменных даследаваннях адыгралі распрацаваныя Леанідам Іванавічам новыя оптыка-спектраскапічныя, лазерныя і СВЧ-метады дыягностыкі плазмы. Сканструіраваная і зробленая пад яго кіраўніцтвам спецыяльная спектральная апаратура дазволіла вырашыць шэраг важных задачаў пры вывучэнні гіпергукавых палётаў целаў у атмасферы і касмічных даследаваннях. Высокую адзнаку атрымала створаная на аснове гэтай апаратуры дыягнастычная сістэма "Гама".

З даследаваннямі па плазменнай тэматыцы шчыльна злучаюцца працы Л.І.Кісялеўскага ў галіне дыстанцыйнай спектраметрыіі. Пад яго кіраўніцтвам у Інстытуце фізікі АН БССР была створаная серыя спектраметраў, прызначаных для даследавання прыроднага асяроддзя з самалётаў і спадарожнікаў. У прыватнасці, першы айчынны спадарожнікавы малагабарытны хуткасны спектраметр бачнага дыяпазону МСС-2 быў устаноўлены на арбітальнай навуковай станцыі "Салют-4". Апрацоўка атрыманага з яго дапамогай велізарнага матэрыялу, выкананая ў навуковых установах АН БССР і АН СССР, дазволіла перайсці да стварэння оптыка-геаграфічнай мадэлі геасферы — асновы дыстанцыйных метадаў вывучэння прыродных рэсурсаў Зямлі.

Найбольш яскравая рыса навуковага стылю Л.І.Кісялеўскага — арганічнае спалучэнне тэорыі з практыкай, накіраванасць праводзімых ім фундаментальных даследаванняў на вырашэнне актуальных народна-гаспадарчых задачаў. Кіраваны Леанідам Іванавічам навуковы калектыў распрацаў плазменнае прыстасаванне для атрымання абарончага і дэкаратыўнага слою на паверхні будаўнічых матэрыялаў. Была адпрацаваная тэхналогія і створаная першая ў СССР доследна-прамысловая лінія плазменнай апрацоўкі цэглы і бетонных вырабаў. Працы па дыстанцыйнай спектраметрыі сталі навуковай асновай для распрацоўкі эфектыўных метадаў кантролю за станам пасеваў і выяўлення на ранняй стадыі захворванняў сельскагаспадарчых раслінаў.

Вынікі навуковых даследаванняў Леаніда Іванавіча надрукаваныя ў 200 навуковых артыкулах. А напісаная з яго ўдзелам манаграфія "Плазменная металургія ў вакууме" стала настольнай кнігай для навуковых работнікаў і інжынераў, якія працуюць у галіне іённа-плазменнай тэхналогіі.

Дзейнасць Л.І.Кісялеўскага на пасадзе рэктара БДУ была накіраваная на перабудову навучальнага працэса, звязаную з падрыхтоўкай спецыялістаў па прыярытэтных накірунках эканамічнага і духоўнага развіцця краіны. Яскравым прыкладам стала адкрыццё пры універсітэце Навукова-даследчага інстытута ядзерных праблем. На новы якасны ўзровень узняліся ў БДУ даследаванні ў галіне фізікі плазмы і яе дадаткаў, прызнаннем чаго стала рэспубліканская комплексная праграма "Плазма-2" (навуковы кіраўнік — Л.І.Кісялеўскі).

Не адно пакаленне студэнтаў-фізікаў выхавалася на яскравых і змястоўных лекцыях Леаніда Іванавіча за той час, калі ён узначальваў кафедру атамнай фізікі, пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана 25 кандыдатаў і дактароў навук.

Л.І.Кісялеўскі актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным жыцці краіны як дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, член ЦК КПБ. Ён быў членам адміністратыўнага савета Міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў, старшынёй Савета рэктараў Мінска, старшынёй Навуковага савета АН БССР па праблеме "Фізіка і тэхніка плазмы", галоўным рэдактарам часопіса "Вакуумная тэхніка і тэхналогія".

За плённую дзейнасць Леаніду Іванавічу было нададзена званне Заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, ён быў узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі.

Адзначаючы 70-годдзе з дня нараджэння Леаніда Іванавіча Кісялеўскага, мы аддаем даніну павагі навукоўцу, грамадзяніну, чалавеку, жыццё якога — яскравы прыклад служэння сваёй Радзіме, імкненне бачыць нашу Беларусь у шэрагу цывілізаваных краінаў.



*Мы працягваем знаёміць нашых чытачоў з камп'ютэрнай сеткай Інтэрнэт і прапануем наступны артыкул з серыі матэрыялаў, прысвечаных тым, хто збіраецца працаваць у гэтай галіне.*

# Што такое Інтэрнэт

## III Адрасная структура

*9. Што такое даменнае імя (domain name)?*

Такая велізарная сістэма як сусветная камп'ютэрная сетка не магла б функцыянаваць стабільна, калі б не мела іерархічнай будовы. Іншая справа, што будова гэтая высокаінтэлектуальная, і складанасць яе неадчувальная для карыстальніка. З нашага з вамі пункту гледжання істотнымі ў Інтэрнэце, менавіта ў WWW, з'яўляюцца два ўзроўні: камп'ютэры чытачоў і сэрверы — камп'ютэры ўладальнікаў інфармацыі. Які механізм іх узаемадзеяння, як выбіраецца маршрут пераносу звестак — такія праблемы ніколі не будуць нас турбаваць падчас працы. Адзінае, што застаецца за чалавекам,- уваходзячы ў World Wide Web, паведамляць адрас сэрвера, з якім трэба ўсталяваць кантакт, а потым слізгаць (*surf*) па сістэме гіперсувязяў, гартаць (*browse*) старонкі дакументаў і займацца сваёй непасрэднай справай: шукаць, аналізаваць і збіраць інфармацыю.

Кожны вузел глабальнай камп'ютэрнай сеткі — сэрвер — мае свой лічбавы адрас, *IP address*, звязаны з геаграфічнымі каардынатамі адпаведнай мясцовасці (напрыклад, 204.165.3.27). Для чалавека больш зручным з'яўляецца запіс літарамі, таму сэрверу, акрамя коду *IP*, прыдаецца унікальная назва — **даменнае** (націск на другім складзе) **імя**, *domain name*. Апошняй формай ідэнтыфікацыі мы і будзем карыстацца ў далейшым, тым болей што камп'ютэр здольны амаль імгненна супаставіць даменнае імя з рэальным лічбавым адрасам.

Даменнае імя складаецца з некалькіх частак (мінімум — дзвюх), аб'яднаных кропкамі. Web-сэрвер БДУ, у прыватнасці, мае імя *bsun.bsu.minsk.by*, а Web-сэрвер кампаніі *Microsoft* — імя *www.microsoft.com.* Апошняя частка імені (у нашых прыкладах *.by*'і *.com*) завецца суфіксам. Дзвюхлітарны суфікс — гэта код краіны, дзе знаходзіцца сэрвер (*.by* — Беларусь, *.de* — Германія, *.uk* — Велікабрытанія, *.nl* — Нідэрланды). Злучаныя Штаты амаль не карыстаюцца сваім геаграфічным суфіксам *.us*, а замест яго пішуць трохлітаравы функцыянальны: *.com* азначае камерцыйную установу, *.gov* — урадавую, *.edu* — адукацыйную, *.mil* — ваенную, *.org* — іншую некамерцыйную, *.net* — звязаную з дзейнасцю Інтэрнэту. (Заўвага: невялікая колькасць еўрапейскіх сэрвераў таксама мае трохлітаравыя суфіксы.)

Даменныя імёны камп'ютэраў, што ствараюць World Wide Web, звычайна (але не заўсёды) пачынаюцца з літараў *www.* а ў астатняй частцы (частках) назвы даецца поўны ці скарочаны тытул установы — уладальніка сэрвера. Такая слоўная канструкцыя аказваецца вельмі зручнай і лёгка запамінальнай, што мы і праілюструем наступнымі прыкладамі:

American Chemical Society, ЗША: *www.acs.org*

Выдавецтва Elsevier Science, Нідэрланды: *www.elsevier.nl.*

*10. Што такое URL ?*

У World Wide Web кожны дакумент мае свой адрас — URL (*Uniform Resource Locator*).

Звычайна, працуючы з гіпертэкставымі дакументамі. мы нават увагі не будзем звяртаць на іх адрасы — для пераходаў па гіперсувязях дастаткова толькі шчоўкаць клавішай мышкі. Але калі мы пажадаем адразу, не блукаючы, трапіць у патрэбнае месца — без адрасу не абысціся.

Як можа выглядаць *URL*, відаць з наступнага прыкладу:

http://www.elsevier.nl/estoc/week/index.html

Першая група сімвалаў, аддзеленая дзвюхкроп'ем і дзвюма касымі рысамі (*http://*), — тып пратаколу (*HTTP*), па якім камп'ютэр павінен працаваць з дакументам.

Другая група (*www.elsevier.nl*) — даменнае імя сэрвера, дзе знаходзіцца дакумент.

Трэцяя група (*/estoc/week/index.html*) — гэта шлях на сэрверы да дакумента *index.html.* Звернем увагу, што інфармацыя на сэрверы арганізаваная ў форме ўкладзеных каталогаў, а ў адрасе кожны ўзровень пазначаны адной касой рысай.

А як дзейнічаць, калі мы не ведаем дакладнага шляху да дакумента, але мяркуем, што патрэбная інфармацыя ёсць на гэтым сэрверы ? Нічога страшнага, і такія сітуацыі прадугледжаныя. Запішам *URL* у скарочанай форме (пратакол і даменнае імя): *http://www.elsevier.nl* — і камп'ютэр злучыць нас з Галоўнай старонкай (*Home Page*) сэрвера (гл. ніжэй), адкуль бяруць пачатак гіперсувязі.

Мы можам задаць *URL* з часткай шляху: *http://www.elsevier.nl/estoc* — гэта наблізіць нас да патрэбнай інфармацыі.

Гіпертэкставы дакумент можа мець гіперсувязі і да сэрвераў, якія працуюць па іншых пратаколах. Дэтальны разгляд такіх варыянтаў пакуль што адкладзем, толькі пазнаёмімся з найбольш простымі прыкладамі *URL*:

*gopher://odie.niaid.hih.gov*

*ftp://ftp3.netscape.com*

На заканчэнне гэтай тэмы некалькі заўваг па сінтаксісу *URL*:

1. Тэкст *URL* фармуецца з літараў, лічбаў, арыфметычных і спецыяльных сімвалаў.

**У тэксце *URL* не павінны ўтрымлівацца прабелы.** Калі гэта патрабуецца па сэнсу, аўтары замест прабелу пішуць знак падкрэслівання _ (напрыклад, *.../life_sciences/...*).

2. У тэксце *URL* **малая і вялікая літары — не ўзаемазамяняльныя** (англ.: *case sensitive*).

Стандарт запісу *URL* — малыя літары. Але здараецца, што аўтары ў назвах каталогаў выкарыстоўваюць і вялікія літары — будзьце ўважлівымі, не замяняйце іх на малыя.

*11. Што такое Home Page (і што такое ўвогуле старонка) у WWW?*

**Старонкай** (англ. *page*) у World Wide Web называюць аўтаномны гіпертэкставы дакумент. які мае свой адрас (*URL*) і які можна атрымаць у выніку аднаго звароту да сэрвера. Фактычна, гэта асобны файл з тэкстам, ад якога адыходзяць гіперсувязі да іншых файлаў. Звычайна памер старонкі адпавядае колькасці матэрыялу, якая можа змясціцца на 1-3 экранах камп'ютэра. Ёсць, канешне, варыяцыі ў адзін і другі бок: у маёй практыцы найменшая старонка ўтрымлівала чатыры лічбы (гіперсувязь *1996*), найбольшая была роўнай 100 К (практычна, 100 тысячаў сімвалаў).

**Галоўная старонка** (*Home Page*) **сэрвера** — гэта месца, ад якога разрастаецца сістэма гіперсувязяў. Калі параўнаць суму інфармацыйных рэсурсаў сэрвера з кнігай, то адпаведнікам Галоўнай старонкі будзе тытульны ліст, змест і (на жаль, не заўсёды) анатацыя.

Як правіла, на Галоўную старонку (*Home Page*) сэрвера можна патрапіць, запісаўшы URL у форме <пратакол://даменнае_імя>, напрыклад:

http://www.elsevier.nl

Акрамя сваёй Галоўнай старонкі, сэрвер можа мець Галоўныя старонкі (*Home Page*) аўтаномных інфармацыйных блокаў. Напрыклад. Home Page электроннай базы дадзеных "Змест часопісаў" выдавецтва Elsevier Science знаходзіцца па адрасу: *http://www.elsevier.nl/estoc*

*12. Дзе знайсці спісы URL? І ці існуюць ўвогуле (улічваючы маштабы WWW) такія спісы?*

Сапраўды, праблема ёсць. World Wide Web — структура маладая. яна яшчэ толькі пачынае расці, але ўжо складваецца з мноства дакументаў. Друкаваць пералік усіх адрасоў для такой вялікай і дынамічнай сістэмы — справа бессэнсоўная. Тым не менш, ёсць спосабы арыентацыі і ў гэтым акіяне матэрыялу.

Па-першае. існуюць спецыяльныя аўтаматызаваныя сродкі пошуку інфармацыі (*search engines*); з некаторымі з іх мы пазнаёмімся ў далейшых публікацыях.

Па-другое, у WWW можна знайсці дакументы з адрасамі (гіперсувязямі) і нават анатацыямі рэсурсаў Інтэрнэту па пэўнай тэматыцы.

Па-трэцяе, агляды, падрыхтаваныя спецыялістамі, публікуюцца ў часопісах *Searcher* і *DATABASE* і газеце *Information Today*, што выпісвае наша бібліятэка. Цікавыя падборкі адрасоў друкуюцца ў газеце "Компьютерные вести" (праўда, арыентаваныя яны не на навуковых супрацоўнікаў, а на шырокую аўдыторыю).

І апошняе, чытаючы навуковыя часопісы па сваёй тэматыцы, звяртайце ўвагу на аб'явы. Менавіта там вы можаце сустрэць адрас сэрвера, які найбольш поўна задаволіць вашыя інфармацыйныя патрэбы.

*А.РАГОЙША*
*Сорасаўскі вучэбна-інфармацыйны цэнтр па хімічнай адукацыі*
*Кафедра агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі*

# Набор піражных — кампенсацыя за пройгрыш

## Суб'ектыўныя нататкі з адкрытага турніру КВЗ

Калі вы не ведаеце, як стаць "зоркай", чаму рыба не можа стаць чэмпіёнам свету па каратэ, а толькі па даміно; калі так здарылася, што вы яшчэ ніколі не бачылі ўдава на каньках і не хадзілі з ім на рыбалку; калі "златая цепь на дубе том" не асацыіруецца ў вас з "новым рускім"; калі... Не, вам і так папросту неабходна было схадзіць на паседжанне Клуба вясёлых і знаходлівых 1/8 фіналу адкрытага турніру Белдзяржуніверсітэта. А калі б вы ўсё-такі прыцягнуліся, то атрымалі б хаця б частковую кампенсацыю і за жудаснае надвор'е, якое ніяк не хоча стаць вясновым, і за няветлівасць жанчын-гардэробшчыц (колькі смутку і безвыходнасці ў гэтай жорсткай фразе: "КВЗ не распранаем!"). Вам засталося б толькі ўзяць штурмам дзверы актавай залы, заняць месцы свае і рэктарата ды падрыхтаваць вушы для ўспрымання толькі лепшых, найбольш дасціпных жартаў, пакідаючы па-за ўвагай "бурныя і працяглыя" апладысменты (калі б толькі іх!) разагрэтых балельшчыкаў.



І тады пасля "начнога шоў свету" вам давялося б на наступны дзень займацца "спортам", каб быць у форме, калі "да нас прыедзе цырк". Менавіта такія назвы мелі тры дні турніру, менавіта ў наступнай паслядоўнасці выходзілі пераможцы ў фінал: першы дзень — юрысты і ФЭФ, другі — гісторыкі і ФПМІ, трэці — географы і мехмат.

Ці не хацелі б вы "размяцца"? Прапаную зрабіць гэта разам з нашымі "вясёлымі і знаходлівымі".



Раз былі каманды, якія выйшлі на наступны этап, значыць, былі і тыя, хто застаўся. Вядома, ім было не соладка, таму і атрымалі яны набор піражных і камплект кніг "БДУ смяецца" (у якасці дапаможніка?).

Судзілі ўсё гэта выкладчыкі універсітэта, у тым ліку член каманды КВЗ БДУ М.Анішчанка, прарэктар А.Паўлаў, намеснік адказнага сакратара "Народнай газеты" С.Балцэвіч, старшыня прафкама студэнтаў Н.Туромша, рэжысёр праграмы "Усё нармальна, мама!" У.Максімкаў а таксама наш уласны, беларускі (можна сказаць, "белдзяржуніверсітэцкі") Гусман — член каманды КВЗ універсітэта С.Алехнік. Асаблівыя падзякі ў падрыхтоўцы і арганізацыі турніру выказваліся рэктарату, прафкаму студэнтаў і дырэкцыі па справах культуры БДУ. І, вядома, самім студэнтам.

"Кажуць, што толькі ў цырку..."— пачыналася размінка трэцяга дня (каманды геафака, мехмата і інстытута сучасных ведаў).

*— Кажуць, што толькі ў цырку можа адсутнічаць заслона.*

*— Вядома, з яе шыюць касцюмы сланам.*

*— Заслона? Ды ў іх і аркестровая яма зверху!..*

*— Кажуць, што толькі ў цырку можна пабачыць вушастых.*

*— А вы думаеце, каму б тады фокуснікі лапшу вешалі?*

*— Вушы... ногі... галоўнае — хвост! А ўвогуле сучасная хірургія здольная на ўсё.*

Нават Анатоль Васільевіч Паўлаў, які цытаваў любімую фразу выкладчыкаў "ва універсітэце было б лёгка працаваць, калі б не было студэнтаў", пасля трэцяга дня судзейства зразумеў, што гэта не так...

Такім чынам, калі б вы прысутнічалі на ўсіх трох гульнях, дык былі б сведкам таго, як праплывае ў тумане шоў-група "Прыказ" (вось вам і студэнцкі КВЗ — сапраўдныя дымавыя эфекты). Ад конкурсу да конкурсу вы разам з ФПМі вырашалі б, чым усёткі лепей займацца: спортам ці каханнем,— і ў рэшце рэшт сышліся б на тым, што адно другому не замінае. Разам з адным з суддзяў вы зразумелі б, што цырк да нас прыехаў даўно і надоўга.

Дакладна вядома, што жарты — справа сур'ёзная. Таму адразу пасля заканчэння я звярнулася да Сяргея Балцэвіча, які падзяліўся сваімі ўражаннямі:

*— Універсітэцкі КВЗ ўжо трэці год як адноўлены і шыбуе па універсітэцкім жыцці. Нашая каманда на расійскім тэлебачанні сама выйшла з гэтага асяроддзя, была народжаная ім. Менавіта яна падштурхнула універсітэт да гэтага кроку.*

*Увогуле ўражанні добрыя: каманды растуць, раней яны былі больш скаванымі, баяліся сцэны, зараз жа могуць заткнуць за пояс каго хочаш. Нават жарты на маскоўскі КВЗ бяруцца і адсюль. А пра якасць іх сведчыць тое, што ў мінулым годзе нашая каманда ледзь не заняла першае месца.*

*Часам гэтая моладзь абганяе і нас. Яе гумар не зусім студэнцкі, ён трывалы, дарослы. Можна сказаць, КВЗ ужо выбраўся са сваёй калыскі.*

*Стварыць каманду сярод выкладчыкаў? Чаму не? Многія выкладчыкі гуляюць у КВЗ за каманду БДУ. Можа, і варта б... Даеш гульню паміж выкладчыкамі і студэнтамі!.. Гумар выхоўваецца, відаць, у аўдыторыях. Паміж выкладчыкамі і студэнтамі нараджаецца столькі жартаў, што яны выносяцца на сцэну. Толькі выкладчыкі маюць менш часу для стварэння сваёй каманды. А ўвогуле кіраўніцтва універсітэта і факультэтаў вельмі добра ставіцца да студэнтаў, якія гуляюць у КВЗ.*

*Добра, што турнір стаў адкрытым, удзельнічаюць каманды і іншых ВНУ. На другую гульню павінен быць прыехаць Віцебск, але... Вядома, гэта мінус толькі яму, але нейкай "фарбы", магчыма, не хапіла. Гумар — суб'ектыўная рэч, хутка прызвычайваешся да сцэны, разумееш, чаго чакае публіка. А калі збоку ўліваецца новая плынь, яна робіць відовішча больш цікавым, займальным.*

*А.Мукавозчык, камісар беларускіх Клубаў вясёлых і знаходлівых, здзівіўся, што ў нас поўная зала. Але гэта ж натуральна. Калі не хапае месцаў, просяць заносіць крэслы. Ніхто не прымушае гэтых людзей, яны яшчэ і грошы плоцяць...*

*Так, у нас таксама арганізоўваліся вечары. На журфаку існуе добрая традыцыя "пасвячэння ў студэнты". КВЗ тады не было, ставіліся студэнцкія мініяцюры. Мы нават ездзілі ў Маскву, выступалі ў МДУ, усіх здзівілі. Тады жартаваць было лёгка — амаль усё не было дазволена. Калі выходзілі на сцэну і бралі міліцэйскую фуражку, ужо было смешна... Ва універсітэце — моцная глеба для жартаў.*



• • •

*Некаторыя моманты, якія не ўвайшлі ў асноўны тэкст:*

*Бокс я не люблю, зубы, што засталіся, прысвячаю шахматам.*

*— Чаму самалёты не маюць крыламі?*

*— Ну, калі б яны ўсё рабілі, як птушкі...*

*Вы чулі пра дрэсіраваных прапаршчыкаў? Яны кожную лічбу могуць памножыць на дзесяць.*

*— Кажуць, што толькі ў цырку тыгры не кусаюць дрэсіроўшчыка.*

*— Так, іх ад яго ўжо ванітуе.*

*— Кажуць, што толькі ў цырку можна сфатаграфавацца з малпай.*

*— Так і з'явілася новая гульня — "Знайдзі пятнаццаць адрозненняў".*

*Крысціна КУРЧАНКОВА, студэнтка факультэта журналістыкі*

*Фота Івана ПУПШЫНОВІЧА*

### Ад рэдакцыі

**Нагадаем, што турнір КВЗ Белдзяржуніверсітэта праходзіць ужо трэці год, і ў далейшым дырэкцыя па справах культуры — адзін з асноўных арганізатараў мерапрыемства — плануе шэраг новых цікавых праграмаў для студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ.**

**А ў 1/4 фінала на пачатку мая сустрэнуцца ў першай гульні каманды геафака, юрфака, гістфака, а ў другой — ФПМІ, ФЭФа і мехмата.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

Газета падпісана ў друк у 12.00.

17 КРАСАВІКА
Зак. 1790.
Т. 1000 экз.

Распаўсюджваецца бясплатна

220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.

В.а. рэдактара Т.М. КАЗАК

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР